www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

20 верасня 2007 года, № 14 (1965)

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## МАЦУЕМ ПАРТНЁРСТВА

***У Беларускім дзяржаўным універсітэце 13 і 14 верасня прайшоў Другі беларуска-германскі навуковы калёквіум.***



*Рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў вітае шаноўных гасцей: саветніка Пасольства ФРГ у Мінску Фрыда Нільсэна і прафесара Універсітэта Лейпцыга Дытэра Шульца*

У гэтым мерапрыемстве ўдзельнічалі выкладчыкі і навукоўцы БДУ, нашы партнёры з Універсітэта Лейпцыга і Інстытута па праблемах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы імя Фраўэнхофера, а таксама прадстаўнікі МЗС Беларусі, пасольства ФРГ у Мінску, супрацоўнікі Прадстаўніцтва нямецкай эканомікі ў нашай краіне і некаторых нямецкіх фірмаў.

Ва ўрачыстым адкрыцці сустрэчы браў удзел рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў. Пра стан навукі ў БДУ нямецкім гасцям распавялі прарэктар па навуцы прафесар Уладзімір Панькоў, а таксама загадчык кафедры радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі прафесар Алег Шадыра. Затым нашы партнёры наведалі некаторыя факультэты БДУ, дзе на месцы азнаёміліся з дасягненнямі беларускіх навукоўцаў і, у сваю чаргу, правялі тэматычныя прэзентацыі пра развіццё навукі ў Лейпцыгскім універсітэце.

На наступны дзень у рэктараце былі абмеркаваны канкрэтныя напрамкі і формы навуковага супрацоўніцтва, у тым ліку – абмен аспірантамі, магістрантамі і студэнтамі. Датычыцца гэта будзе ў першую чаргу фізічнага, хімічнага, эканамічнага, гістарычнага і філалагічнага факультэтаў, а таксама факультэта міжнародных адносін БДУ. Па выніках калёквіуму падпісаны Пратакол, у які былі ўнесены практычныя прапановы абодвух бакоў.

Нагадаем, што Дамова аб навуковым супрацоўніцтве паміж БДУ і Лейпцыгскім універсітэтам дзейнічае з 2005 года.

**Дзмітрый ЖАРЫН**
**Фота Яўгена ПАМЫТКІНА**

КАНФЕРЭНЦЫІ

## МАДЭЛЯВАННЕ ПРАЗ СТАТЫСТЫКУ

***У Белдзяржуніверсітэце з 12 па 15 верасня адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя "Кампутарны аналіз дадзеных і мадэляванне".***

Яе арганізатарамі выступілі БДУ, Нацыянальны навукова-даследчы цэнтр прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі (ННДЦ ППМІ) БДУ, Беларуская статыстычная асацыяцыя і Венскі універсітэт тэхналогій пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі нашай краіны, Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных навуковых даследаванняў і Беларуска-швейцарскага банка "BelSwissBank".

Форум па дадзенай тэматыцы – буйнейшы на постсавецкай прасторы і ладзіцца раз ў тры гады. Сёлета ў ім удзельнічалі 230 навукоўцаў і маладых даследчыкаў з 18-ці краін свету. Мерапрыемства адкрыў рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў.

У рамках канферэнцыі працавала 9 секцый, на якіх было абмеркавана болей за 100 дакладаў, прысвечаных апошнім навуковым дасягненням у галіне распрацоўкі і прымянення кампутарных метадаў аналізу даных імавернаснай прыроды, статыстычнага мадэлявання складаных сістэм. Гэтая тэматыка адносіцца да перспектыўных навуковых напрамкаў, зацверджаных Саўмінам РБ.

Правядзенне падобнага форуму ў БДУ не выпадковае. Беларускі дзяржаўны універсітэт з'яўляецца вядучай ВНУ краіны ў шэрагу прыярытэтных навуковых напрамкаў, звязаных з распрацоўкай і выкарыстаннем новых інфармацыйных тэхналогій у розных галінах: навуковых даследаваннях, эканоміцы, вытворчасці, абароне інфармацыі, медыцыне, банкаўскай дзейнасці і інш.

Ва універсітэце на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў для работы ў пералічаных напрамках па спецыяльнасцях "Прыкладная матэматыка", "Эканамічная кібернетыка", "Кампутарная бяспека". Праводзяцца таксама навуковыя даследаванні па гаспадарча-дагаворных, бюджэтных і міжнародных навукова-даследчых праектах у рамках ННДЦ ППМІ ў інтарэсах прадпрыемстваў і арганізацый Рэспублікі Беларусь.

Важным складальнікам канферэнцыі стаў удзел маладых навукоўцаў, аспірантаў, магістрантаў і студэнтаў. На ФПМІ БДУ, як вядома, паспяхова навучаецца большасць пераможцаў школьных алімпіяд па матэматыцы і інфарматыцы. Пачынаючы з I-II курсаў, яны прыцягваюцца да навуковых даследаванняў у студэнцкіх навуковых гуртках, а таксама студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі "Кампутарны аналіз даных і мадэляванне", якая ў 2007 годзе была ўзнагароджана Прэміяй Прэзідэнта краіны.

**Падрыхтаваў Яўген ПЕШЧУР**

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

**"У НАС СКЛАЛАСЯ АСАБЛІВАЯ КАРПАРАТЫЎНАЯ КУЛЬТУРА"**
Інтэрв'ю з дырэктарам Інстытута тэхналогій інфарматызацыі і кіравання Валерыем ШАЛІМАМ
Стар. 2

**"ПАЎПРАВАДНІКОВЫЯ ХАЛЬКАГЕНІДЫ – АЛЬТЭРНАТЫЎНЫЯ КРЫНІЦЫ ЭНЕРГІІ"**
Размова з доктарам хімічных навук Яўгенам СТРАЛЬЦОВЫМ
Стар. 3

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

ПАСВЕДЧАННІ лаўрэатаў Спецыяльнага фонда Прэзідэнта нашай краіны па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў уручыў 3 верасня 10-ці педагогам Ліцэя БДУ рэктар Белдзяржуніверсітэта прафесар Васіль Стражаў. Пасля цырымоніі рэктар правёў адкрыты ўрок для ліцэістаў на тэму "Мой родны кут, як ты мне мілы!".

ДЗЯРЖКАНЦЫЛЯРЫЯ КНР па выкладанні кітайскай мовы за мяжой выдзеліла 100 тыс.долараў і болей за 3 тыс. вучэбных матэрыялаў для Інстытута Канфуцыя, які створаны ў БДУ.

ПАДПІСАНА ПАГАДНЕННЕ паміж БДУ і Далянскім палітэхнічным універсітэтам аб стварэнні на базе апошняга Кітайска-беларускага цэнтра міжкультурнай камунікацыі. Цэнтр будзе займацца прапагандай беларускай і рускай моў, а таксама нацыянальнай культуры нашай краіны. Падобная структура – Беларуска-кітайскі цэнтр міжкультурнай камунікацыі – з'явіцца ў перспектыве і ў БДУ.

МІЖНАРОДНАЯ АСАМБЛЕЯ рэктараў славянскіх універсітэтаў пройдзе ў БДУ 8–10 кастрычніка.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

**ПАСЯДЖЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА БДУ**

Пашыранае пасяджэнне Вучонага савета БДУ на тэму "Вынікі работы Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў 2006–2007 навучальным годзе і задачы на 2007–2008 навучальны год" адбудзецца 24 верасня ў 10.15 у актавай зале Ліцэя БДУ (вул. Ульянаўская, 8). Дакладчык – рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў.

УЧЫНАК

## УЗНАГАРОДА ЗА АДВАГУ

***За праяўленую мужнасць у выратаванні двух чалавек студэнт IV курса механіка-матэматычнага факультэта БДУ Сяргей Яфіменка на мінулым месяцы быў прадстаўлены да дзяржаўнай узнагароды – медаля "За адвагу".***

З гэтай нагоды мы вырашылі пагаварыць з самім "віноўнікам", які неўзабаве апынуўся даволі сціплым чалавекам.

**– Сяргей, ты стаў зараз вядомай асобай, даў некалькі інтэрв'ю, лейтматывам якіх гучалі здзейсненыя табой геройскія ўчынкі...**

– Так, мяне часцяком просяць расказаць падрабязнасці тых двух выпадкаў з выратаваннем, у якіх давялося прыняць непасрэдны ўдзел.

**– Тады не будзем адыходзіць ад гэтай прыемнай традыцыі...**

– Першы выпадак здарыўся яшчэ ў 2005 годзе ў красавіку на занятках фізкультуры. Прабягаючы ўздоўж берага Свіслачы трэці круг, я раптоўна заўважыў мужчыну ў вадзе. Доўга не разважаў і кінуўся ў раку. Што наконт другога здарэння, то гэта было адным вечарам на пачатку вясны ў 2006 годзе. Лёд ужо пачаў сыходзіць, а нейкі мужчына, не улічыўшы гэтага, апынуўся ў сцюдзёнай вадзе. Я прапоўз па крызе, дабраўся да яго і асцярожна выцягнуў недарэку на бераг, дзе мне ўжо дапамог мой сябар і аднагрупнік Арцём Гелахаў.

**– Такое здарылася менавіта з табой і двойчы. Гэта прымушае паверыць у наканаванасць лёсу...**

– Не, я ў такія рэчы не веру наогул. На маім месцы гэта зрабіў бы кожны. Героем сябе не лічу зусім.

**– Магчыма, такія ўчынкі не засталіся без увагі з боку спецыялізаваных службаў, звязаных з выратаваннем?**

– Так, дарэчы, нядаўна мне прапанавалі працаваць у ТРВОДзе (Беларускае рэспубліканскае таварыства ратавання на водах. – *рэд.*). Цяпер часта жартую, што калі не атрымаецца з вучобай, то пайду на курсы вадалазаў. Але гэта наўрад ці, бо я цалкам задаволены абранай спецыяльнасцю.

**– А хто быў тваім любімым супергероем ў дзяцінстве?**

– *(усміхаецца)* Чамусьці адразу згадаўся воўк з мультфільма "Ну, пачакай!". А калі казаць пра выратавальнікаў – няма найлепшых за Чыпа і Дэйла *(смяецца)*.

**– А што паўплывала на тваю схільнасць да дапамогі ў любы момант і абставінах?**

– У першую чаргу, трэба аддаць належнае майму тату. Ён ваенны чалавек і з дзяцінства вучыў мяне мужнасці і здольнасці арыентавацца ў экстрэмальных сітуацыях. Безумоўна, паўплывала на мяне і дружнае студэнцкае асяроддзе, дзякуючы якому пачынаеш разумець сапраўдную каштоўнасць дапамогі і падтрымкі ў жыцці.



**Алена ГАЛКОЎСКАЯ,**
**Таццяна ЯНКОЎСКАЯ**
**Фота Кацярыны ШАТАВО**

УСТАНОВЫ

# Валерый ШАЛІМА: "У НАС СКЛАЛАСЯ АСАБЛІВАЯ КАРПАРАТЫЎНАЯ КУЛЬТУРА"



***У нашым універсітэце нядаўна ўзнікла новая адукацыйная ўстанова — Інстытут тэхналогій інфарматызацыі і кіравання (ІТІК), які быў створаны на базе спецфакультэта бізнэсу і інфармацыйных тэхналогій БДУ.***

Слухачы Інстытута атрымоўваюць дыплом дзяржаўнага ўзору аб перападрыхтоўцы на аснове вышэйшай адукацыі з прысваеннем новай кваліфікацыі. Чытаем водгукі яго выпускнікоў: "На нашым курсе ўсе былі зацікаўленыя атрымаць веды, імкнуліся да прафесійнага росту. Узровень гэтай навучальнай установы – гэта вялікая падтрымка і ступень у кар'ерных памкненнях"; "Мне было б намнога складаней арыентавацца ў сваёй рабоце без тэарытычных ведаў, якія я тут атрымаў"; "Я палічыў патрэбным, каб і людзі, якія працуюць са мной у адной камандзе, таксама атрымалі ваш дыплом" і г. д.

Пасля пераўтварэння ІТІК зможа пашырыць спектр адукацыйных паслуг. Хутка тут пачнуць функцыянаваць два факультэты: акрамя факультэта перападрыхтоўкі кадраў, з'явіцца факультэт павышэння кваліфікацыі. Пра дасягненні і апошнія змяненні мы пагутарылі з дырэктарам установы, кандыдатам фізіка-матэматычных навук Валерыем ШАЛІМАМ.

**— Інстытут тэхналогій інфарматызацыі і кіравання – новая структура ў БДУ. Аднак яна мае даўнія адукацыйныя традыцыі і заваявала пэўны аўтарытэт. Калі менавіта ўзнікла патрэба ў перападрыхтоўцы кадраў адпаведнай кваліфікацыі?**

– Усё пачалося пасля стварэння ў 1987 годзе згодна з пастановай ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР спецыяльнага факультэта перападрыхтоўкі кадраў па прыкладной матэматыцы Белдзяржуніверсітэта на базе і ў цесным супрацоўніцтве з факультэтам прыкладной матэматыкі.

Дваццаць гадоў таму пачынаў фарміравацца беларускі рынак адукацыйных паслуг, і каб не страціць свайго лідзіруючага становішча, кіраўніцтва БДУ пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і навукі Беларусі пачало заахвочваць ініцыятывы факультэтаў па арганізацыі мабільных адукацыйных структур, здольных аператыўна рэагаваць на новыя адукацыйныя запатрабаванні. У сувязі з пераменамі на рынку працы ўзнік вялікі пласт людзей з вышэйшай адукацыяй, якія жадалі дастаткова радыкальна змяніць сферу сваёй прафесійнай дзейнасці. Студэнты старэйшых курсаў імкнуліся павысіць свае шанцы на працаўладкаванне, атрымаўшы дадатковую адукацыю да моманту заканчэння БДУ. Жаданне стварыць пры факультэце прыкладной матэматыкі структурнае падраздзяленне, што рэалізоўвала б праграмы перападрыхтоўкі ў сферы прадпрымальніцтва, эканомікі і інфармацыйных тэхналогій, прывяло да арганізацыі спецыяльнага факультэта бізнэсу і інфармацыйных тэхналогій, які адразу пачаў існаваць па прынцыпах самаакупнасці.

Ідэя аказалася плённай. Ад жадаючых атрымаць дадатковую кваліфікацыю не было адбою. На працягу некалькіх гадоў факультэт настолькі ўзмацніўся, што ў 1996 годзе былі адкрыты два філіялы: у Гродне і ў Брэсце. За гэты час дыпломы аб перападрыхтоўцы і пасведчанні аб павышэнні кваліфікацыі атрымалі 8 тысяч чалавек.

**— Інстытут – буйнейшая за факультэт навучальная структура. Скажыце, якія арыенціры, у адрозненне ад папярэдніх гадоў, абраны сёння?**

– Інстытут будзе развівацца ў неадрыўнай сувязі з базавым факультэтам, якім з'яўляецца ФПМІ. Асноўная мэта дзейнасці Інстытута тэхналогій інфарматызацыі і кіравання БДУ – ажыццяўленне прафесійнай арыентацыі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў на базе вышэйшай адукацыі ў сферы перадавых інфармацыйных тэхналогій і прадпрымальніцкай дзейнасці.

Трэба сказаць, што мы заўсёды аператыўна рэагавалі на змены эканамічных умоў развіцця рынка працы ў Рэспубліцы Беларусь, адкрываючы новыя і ўзмацняючы актуальныя для адпаведнага перыяду напрамкі перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі, а таксама пашыраючы спектр адукацыйных паслуг. Менавіта з патрабаваннямі часу і былі звязаны рэарганізацыі, якія паўплывалі на змяненне першапачатковых назваў нашай установы.

Сёння ДУА "Інстытут тэхналогій інфарматызацыі і кіравання" ўваходзіць у склад адзінага комплексу БДУ са статусам юрыдычнай асобы, ажыццяўляе сваю дзейнасць на ўмовах поўнага гаспадарчага разліку, не прыцягваючы бюджэтных сродкаў.

Мы аказваем адукацыйныя паслугі па перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі інжынерна-тэхнічнага і кіраўніцкага персаналу айчынных прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, навучанне беспрацоўных, накіраваных службамі занятасці насельніцтва, а таксама даем магчымасць атрымання дадатковай адукацыі студэнтам выпускных курсаў.

У структуру Інстытута ўваходзяць галоўнае падраздзяленне ў Мінску і два філіялы ў Гродне і Брэсце. Склад слухачоў налічвае болей за 1 тысячу чалавек.

У маі 2007 года Інстытут тэхналогій інфарматызацыі і кіравання БДУ акрэдытаваны ва ўстаноўленым парадку. Перападрыхтоўка слухачоў ажыццяўляецца адпаведна ліцэнзіі па васьмі спецыяльнасцях на вочнай (дзённай і вячэрняй) і завочнай формах навучання.

Павышэнне кваліфікацыі кадраў з вышэйшай адукацыяй праводзіцца па наступных напрамках: "Прыродазнаўчыя навукі", "Кіраванне", "Інфармацыйная бяспека", "Вылічальная тэхніка", "Эканоміка".

**— Навучанне асновам эканомікі на базе матэматычных ведаў, асваенне слухачамі сучасных інфармацыйных тэхналогій было ў вашай практыцы і раней. Якія новыя адукацыйныя паслугі прапануеце вы сёння?**

– Згодна з пастановай Савета Міністраў краіны і Міністэрства адукацыі Беларусі ІТІК БДУ вызначаны як установа, што забяспечвае павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, падначаленых ураду Рэспублікі Беларусь, у кампетэнцыю якіх уваходзіць забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі. Пачынаючы са снежня 2005 года, у Інстытуце праводзяцца штогадовыя семінары з трохгадовым цыклам па цяперашніх праблемах інфармацыйнай бяспекі, у якіх ужо прынялі ўдзел болей за 50 чалавек. Асноўны кантынгент – міністры, намеснікі міністраў, кіраўнікі прадпрыемстваў, падначаленых ураду нашай краіны.

У мінулым годзе болей за 150 слухачоў прайшлі навучанне на курсах павышэння кваліфікацыі па наступных тэмах: "Бяспека карпаратыўных інфармацыйных сетак", "Бяспека інфармацыйных тэхналогій", "Асновы бяспекі інфармацыйных тэхналогій".

Згодна з загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь на ІТІК БДУ былі ўскладзены функцыі навукова- і вучэбна-метадычнага забеспячэння павышэння кваліфікацыі супрацоўнікаў органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, падначаленых ураду Рэспублікі Беларусь, у кампетэнцыю якіх уваходзіць забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі пэўных органаў (арганізацый). У сувязі з гэтым створаны навукова-метадычны савет па павышэнні кваліфікацыі па інфармацыйнай бяспецы. У яго склад увайшлі прадстаўнікі 6-ці арганізацый (у тым ліку Дзяржаўнага цэнтра па бяспецы інфармацыі пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, НДІ тэхнічнай абароны інфармацыі).

**— Наяўнасць кваліфікаваных кадраў, ліцэнзій, вучэбных аўдыторый і тэхнічнае аснашчэнне навучальнага працэсу — гэта фактары, якія аказваюць уплыў на функцыянаванне і развіццё любой адукацыйнай установы. Як выглядае гэта сітуацыя ў ІТІК?**

– Вучэбны працэс у нашай установе ажыццяўляецца ў аўдыторыях і вучэбных класах, якія аснашчаны сучаснай камп'ютарнай і аргтэхнікай. Камп'ютарныя класы аб'яднаны ў лакальную сетку, супрацоўнікам і слухачам забяспечаны доступ у Інтэрнэт. Супрацоўнікі і слухачы Інстытута абслугоўваюцца на абанеменце ў чытальных залах Фундаментальнай бібліятэкі БДУ, Брэсцкага тэхнічнага універсітэта, Гродненскага дзяржаўнага універсітэта. На базе гродненскага філіяла створаны бібліятэчны фонд з агульнай колькасцю вучэбных дапаможнікаў каля 7 тыс. экзэмпляраў. Пры правядзенні акрэдытацыі Інстытута камісія Дэпартамента па кантролі якасці адукацыі Міністэрства адукацыі высока ацаніла арганізацыю метадычнай работы ў Інстытуце.

З выкладчыцкай дзейнасцю ў нас таксама ўсё ў парадку: мы імкнемся задзейнічаць самыя лепшыя кадры факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ, а таксама іншых ВНУ нашай краіны. Адзінае, што засмучае, – недахоп аўдыторый. Не вырашыўшы пытанне з вучэбнымі плошчамі, нельга арганізоўваць новыя напрамкі ў перападрыхтоўцы кадраў і павышэнні кваліфікацыі па профілях Інстытута, навучанне слухачоў па новых высокатэхналагічных кірунках развіцця інфармацыйных тэхналогій.

**— Што ваша ўстанова можа супрацьпаставіць канкурэнтам на адукацыйным рынку?**

– Вострая канкурэнцыя на рынку працы вымушае многіх ізноў сядаць за парту. Дыплом аб перападрыхтоўцы на базе вышэйшай адукацыі, як правіла, атрымоўваюць людзі, якія адчулі недахоп фундаментальных ведаў і жадаюць пацвердзіць свой прафесійны статус. Рынак паслядыпломнай адукацыі з кожным годам расце, а колькасць структур, якія прапаноўваюць яшчэ адзін дыплом, павялічваецца. Аднак Інстытут інфарматызацыі і кіравання БДУ – адзін з найстарэйшых на рынку адукацыйных паслуг у сферы паслядыпломнай адукацыі і валодае велізарным практычным досведам.

Акрамя таго, цеснае супрацоўніцтва з вядучымі вучонымі і выкладчыкамі розных факультэтаў БДУ (у першую чаргу ФПМІ), а таксама з кіраўнікамі прадпрыемстваў і арганізацый дазваляе адсочваць і аператыўна рэагаваць на новыя тэндэнцыі і патрабаванні адукацыйнага рынку нашай краіны.

Наш навучальны працэс прадугледжвае вывучэнне прадметаў, непасрэдна звязаных са спецыяльнасцю. Слухачы Інстытута – гэта ў асноўным людзі, якія маюць моцную адукацыйную базу, вызначыліся ў жыцці і добра ведаюць, якая канкрэтна інфармацыя ім неабходна. Таму ў нас няма лішніх дысцыплін. Адукацыйныя праграмы змяняюцца і дапаўняюцца ў залежнасці ад запатрабаванасці той або іншай прафесіі на рынку працы.

Наша адметнасць яшчэ і ў тым, што мы намагаемся як мага болей прыцягваць да выкладчыцкай дзейнасці кваліфікаваных навукова-педагагічных кадраў з ліку вядучых спецыялістаў ВНУ (зараз у штаце 2 дактары навук і 20 кандыдатаў навук) і спецыялістаў-практыкаў з ліку супрацоўнікаў банкаўскай сістэмы, вытворчых, камерцыйных і інвестыцыйных кампаній.

І самае важнае – у нашым Інстытуце за доўгія гады працы склалася асаблівая карпаратыўная культура і агульная атмасфера добразычлівасці. Для нас самая галоўная персона – гэта наш слухач.

**Гутарыла Ганна ЛАГУН**
**Фота Кацярыны ШАТАВО**


## АБ'ЯВА

### ШКОЛА МЭНЭДЖМЭНТУ І ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА ДЛЯ МОЛАДЗІ

**запрашае актыўных, амбіцыйных, накіраваных на поспех студэнтаў БДУ прайсці навучанне**

Слухачам даецца унікальны шанец: зрабіць паспяховы старт, які дапаможа ў далейшым знайсці і рэалізаваць сябе ў дзелавой сферы, развіць якасці лідара, сфарміраваць прадпрымальніцкі дух, авалодаць законамі рыначнай эканомікі, навучыцца фінансавай пісьменнасці, выхаваць у сабе эканамічную культуру.

Толькі для Вас сучасныя метады і тэхналогіі навучання, вядучыя выкладчыкі, прафесійныя трэнеры-кансультанты, паспяховыя бізнэсмэны, практыкаваныя спецыялісты, эксклюзіўныя аўтарскія курсы.

Слухачам, якія паспяхова прайшлі праграму навучання, выдаецца сертыфікат БДУ.

**Запіс да 1 кастрычніка 2007 г.**

**Форма навучання:** вочна-вячэрняя. **Тэрмін навучання:** 5 месяцаў. **Рэжым заняткаў:** 8 гадзін у тыдзень.

**Кантактная інфармацыя:** г. Мінск, вул. Ленінградская, 8, каб. 314 (корпус юрыд. ф-та БДУ). Факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Інстытута сістэмных даследаванняў праблем моладзі БДУ.

Тэл. 209-55-18.

**ВЫКАРЫСТАЙЦЕ ШАНЕЦ ЗАКЛАСЦІ ФУНДАМЕНТ ДЛЯ БУДУЧАЙ КАР'ЕРЫ!**


ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# ЭЛЕКТРОННЫЯ СРОДКІ Ў ДАПАМОГУ СТУДЭНТАМ

***6 верасня 2007 г. дацэнт кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі Сяргей БАСЯКОЎ быў ушанаваны "Ганаровай граматай ЦК БРСМ за творчасць і ініцыятыву", а таксама грашовай прэміяй у памеры 150-ці тыс. руб.***

Грамата ўручана па выніках конкурсу інавацыйных праектаў у галіне інфармацыйных тэхналогій за распрацоўку пакета аналітычных вылічэнняў, арыентаванага на рашэнне задач механікі і тэорыі пругкасці. У распрацоўцы і апрабацыі новага праграмнага сродку таксама ўдзельнічалі намеснік дэкана механіка-матэматычнага факультэта дацэнт Дзмітрый Мядзведзеў і намеснік начальніка аддзела інфармацыйна-тэхналагічнага забеспячэння навучальнага працэсу Аляксандр Гаркун. Пакет паспяхова прайшоў экспертызу ў Аб'яднаным інстытуце праблем інфарматыкі НАН Беларусі і быў прадстаўлены як самастойны праграмны прадукт на некалькіх міжнародных канферэнцыях.

Распрацаваны электронны сродак прадугледжвае новыя кампутарныя функцыі, якія можна выкарыстоўваць як для атрымання даведачнай інфармацыі па класічнай тэорыі пругкасці, так і непасрэдна для рашэння канкрэтных тэарэтычных і практычных задач механікі дэфармаванага цвёрдага цела.

Пакет ужо ўсталяваны ў кампутарных класах механіка-матэматычнага факультэта і выкарыстоўваецца падчас выкладання асноўных і спецыяльных курсаў.

**Настасся ЮДЧЫЦ**

НАВУКОВЫ ІНТАРЭС

***29 жніўня споўнілася 50 гадоў доктару хімічных навук, прафесару Яўгену СТРАЛЬЦОВУ. Прапануем вашай увазе гутарку з гэтым няўрымслівым чалавекам і апантаным вучоным.***

## Яўген СТРАЛЬЦОЎ: "ПАЎПРАВАДНІКОВЫЯ ХАЛЬКАГЕНІДЫ – АЛЬТЭРНАТЫЎНЫЯ КРЫНІЦЫ ЭНЕРГІІ"

Свой юбілей Яўген Анатольевіч сустрэў з сур'ёзным багажом навуковых і асабістых дасягненняў. Працуючы прафесарам на кафедры неарганічнай хіміі хімічнага факультэта БДУ, ён з'яўляецца аўтарам шматлікіх артыкулаў у навуковых выданнях Беларусі, Расіі, далёкага замежжа, рэцэнзентам аўтарытэтных міжнародных часопісаў "Electrochimica Acta", "Thin Solid Films", "Journal of Materials Science", сакратаром Савета па абароне дысертацый пры БДУ і кіраўніком паспяховых аспірантаў. Сфера інтарэсаў навукоўцы – працэсы электрахімічнага асаджэння адатамных слаёў на паверхні паўправадніковых і металічных электродаў, электрахімічны сінтэз паўправадніковых халькагенідаў, фотаэлектрахімія паўправаднікоў. А ў вольны ад навукі час Яўген Анатольевіч з захапленнем будуе хату на ўласным лецішчы.

**– Чаму калегі, жартуючы, называюць Вас "кіраўніком пакалення Івановых"?**

– Дзмітрый Іваноў прыйшоў да мяне яшчэ на другім курсе і пачаў займацца навуковай работай. У 2005 годзе ён датэрмінова абараніў кандыдацкую дысертацыю. Зараз працуе асістэнтам на кафедры, а неўзабаве стане дацэнтам. Юлія Іванова – жонка Дзмітрыя – другі год у аспірантуры і плённа працуе над сваёй дысертацыяй. Пяцьяе артыкулаў былі надрукаваны ў падлеглых рэцэнзіі часопісах, прычым чатыры з іх яна падрыхтавала на англійскай мове для міжнародных выданняў. У наступным годзе яна будзе абараняцца – мяркую, таксама датэрмінова, бо аспірантка ўжо выканала амаль увесь план. Нядаўна Дзмітрый і Юлія выйгралі грант і ўдзельнічалі ў навуковай канферэнцыі, якая адбылася ў Іспаніі. Віталь Іваноў (цёзка па прозвішчы, ніякіх роднасных дачыненняў да першых двух Івановых не мае) у гэтым годзе скончыў факультэт і паступіў у магістратуру, плануе працягваць навуковую дзейнасць у аспірантуры – вельмі здольны малады чалавек, у якога ёсць жаданне працаваць, даследаваць, што вельмі важна для дасягнення добрых вынікаў.



**– У чым сакрэт датэрміновай абароны дысертацыі – што даволі рэдкая з'ява для аспірантаў-хімікаў?**

– Малады навуковец мусіць быць здольным сканцэнтравацца падчас перыяду падрыхтоўкі, спланаваць з дапамогай кіраўніка свой працоўны дзень, не губляць часу дарэмна.

**– Якім чынам Вы сталі адным з рэцэнзентаў афіцыйнага часопіса міжнароднай электрахімічнай супольнасці "Electrochimica Acta" ад выдавецтва "Elsevier", дзе выходзіць большасць навуковых публікацый у свеце?**

– Мяне запрасілі два гады таму, калі заўважылі па матэрыялах, якія выходзілі на старонках згаданага выдання. Мне, як і яшчэ двум рэцэнзентам, рэгулярна дасылаюць артыкулы, мы іх ацэньваем, выказваем рэдактару свае меркаванні, а ён тады прымае рашэнне – ставіць у нумар ці адсеяць як інфармацыйны шум. Надоечы даслалі падзяку ў сувязі з тым, што якасць часопіса за апошні год узрасла.

**– Распавядзіце, калі ласка, пра Вашы навуковыя даследаванні.**

– Вы, мабыць, памятаеце са школьных часоў, што калі ў раствор меднага купаросу памясціць цвік, то на ім асядзе медзь. У адпаведнасці з электрахімічным шэрагам напружання металаў адбываецца з'ява кантактнага замяшчэння меней актыўных металаў у растворы соляў больш актыўнымі. Калі тую ж медзь электрахімічна асаджаць на золата (меней актыўны металл, чым медзь), яна асадзіцца досыць спецыфічна – не ў выглядзе часцінак, што растуць у трох вымярэннях (трохмерны зародак), а асобнымі атамамі, утвараючы атамны слой па ўсёй паверхні золата. У навуковай літаратуры гэтая з'ява атрымала назву "underpotential deposition", што значыць падпатэнцыйнае асаджэнне, ці асаджэнне з неданапружаннем. У асноўным у гэтай вобласці вывучалі асаджэнне металаў на металы, мой жа ўнёсак – даследаванне асаджэння металаў на халькагены. Пры гэтым атрымоўваюцца паўправадніковыя халькагеніды – а паўправаднікі зараз запатрабаваны ў тэхніцы, мікраэлектроніцы, аптычных прыборах, пераўтваральніках сонечнай энергіі. Гэта вельмі актуальная распрацоўка ў рэчышчы пошукаў альтэрнатыўных крыніц энергіі. У рэспубліцы няма паліваў, што ўтрымліваюць вуглярод – мы маглі б выкарыстоўваць тэлурыт кадмію, напрыклад, для стварэння сонечных батарэй: ён дазваляе назапашваць сонечнае святло і пераўтвараць яго ў электраэнергію. Беларусь – не самая багатая на сонечныя дні краіна, але навукаёмістыя тэхналогіі можна было б экспартаваць. Масавая вытворчасць тэлурыту кадмію ў выглядзе тонкіх плёнак для пакрыцця вялікіх паверхняў узніме пытанне асцярожнай утылізацыі адпрацаваных элементаў, бо кадмій адносіцца да цяжкіх металаў. У той жа час, свінцовыя акумулятары выкарыстоўваюцца шырока, і ніхто не задумваецца, якая частка свінцу рассейваецца (у краінах жа Заходняй Еўропы да 99 % яго збіраецца на спецыяльных пунктах).

**– Хіміяй цікавіліся з дзяцінства?**

– Мама з татам былі хімікі, я чуў іх "хімічныя" размовы. Характар у мяне без вострых супярэчнасцяў, таму, калі бацькі запыталіся пра мой выбар, я спакойна пацвердзіў сваю цікаўнасць да гэтай прафесіі – любоў да хіміі ў мяне спадчынная. Затое дзеці наадрэз адмовіліся ісці па маіх слядах: дачка вучыцца на біялагічным факультэце, а сын – на радыёфізічным.

**– Мабыць, праводзілі ў дзяцінстве вопыты, стваралі порах?**

– Не, нічога выбуханебяспечнага не ладзіў. Я ўвогуле праціўнік хімічных эксперыментаў у хатніх умовах – гэта заўсёды значыць невыкананне тэхнікі бяспекі, бо няма ні выцяжных шафаў, нічога. Прытым разуменне дзецьмі таго, што яны робяць, знаходзіцца на вельмі нізкім узроўні, і часта такія вопыты заканчваюцца сумна. Так, адзін наш былы студэнт, заняўшыся эксперыментамі дома, пашкодзіў сабе лёгкія. Чытайце літаратуру, вучыце тэорыю – каб праводзіць эксперыменты, трэба мець досыць многа ведаў, быць добра падрыхтаваным, умець карыстацца прыборамі. Менавіта таму на малодшых курсах у нас выкладаюць больш тэорыі. Пераліванне рэчываў з прабірак у колбы, якасныя рэакцыі – гэта прымітыў, які не мае дачынення да сучаснай навукі.

**– Якія перспектывы ў хімфака?**

– У той галіне, дзе я займаюся, хапае праблем. Адна з асноўных – абсталяванне, якое было набытае універсітэтам, мабыць, яшчэ ў 80-я і састарэла фізічна і маральна. Новае ж надта дарагое. Даводзіцца перакваліфікоўвацца з практыкаў у тэарэтыкі, але далёка не ва ўсіх гэта атрымоўваецца.

**– Калі вас запросяць працаваць за мяжой...**

– ...Хутчэй за ўсё, не паеду. Люблю вандраваць па ўсім свеце, але больш за ўсё люблю вяртацца дадому.

**Гутарыла Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

## АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**
**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ аналітычнай хіміі;

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ метадаў аптымальнага кіравання;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі, вылічальнай матэматыкі, тэхналогіі праграмавання, дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі, метадаў аптымальнага кіравання, арганічнай хіміі, радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, гісторыі новага і найноўшага часу, фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: тэхналогіі праграмавання, англійскага мовазнаўства, класічнай філалогіі, агульнай і клінічнай псіхалогіі, грамадзянскага права, крымінальнага права, крыміналістыкі, паліталогіі;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: крымінальнага права, паліталогіі;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных сістэм кіравання, матэматычнага забеспячэння ЭВМ.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**
**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ДАЦЭНТА кафедры кіравання фінансамі і маёмасцю;

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА кафедры эканамічнага права.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Batанічная, 15, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 210-01-10.**

**ДА ЎВАГІ АБІТУРЫЕНТАЎ!**

**Цэнтр філалагічных паслуг філалагічнага факультэта БДУ абвяшчае набор слухачоў па падрыхтоўцы:**

– да цэнтралізаванага тэсціравання па мовах (руская, беларуская, замежная);

– да ўступных экзаменаў у навучальныя ўстановы па рускай і беларускай літаратурах, замежных мовах.

Фарміруюцца групы слухачоў у колькасці 3–6 чалавек.

Выкладчыкі Цэнтра – высокакваліфікаваныя спецыялісты, дацэнты, кандыдаты навук.

**Заняткі ладзяцца з кастрычніка 2007 г. па май 2008 г.**

**Наш адрас: вул. К. Маркса, 31, аўд. 59, тэл. 222-33-65.**

СВЯТКАВАННЕ

## КНІГІ БДУ Ў ШКЛОВЕ

***2 верасня ў горадзе Шклоў Магілёўскай вобласці адгучала ўрачыстае свята Яе Вялікасці Кнігі – Дзень беларускага пісьменства.***

У горад на Дняпры прыбыло мноства ўдзельнікаў і гасцей з Расіі, Украіны, Балгарыі, Сербіі, В'етнама, Венесуэлы, ЗША, Індыі, Казахстана, Кубы, Кыргызстана, Лівіі, Малдовы, Палесціны, Славакіі, Таджыкістана, Туркменістана.

Ва ўрачыстасцях прынялі ўдзел прадстаўнікі ўлады, духавенства, выдаўцы, навукоўцы, пісьменнікі, журналісты, студэнты і школьнікі, артысты.



*Рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў сярод удзельнікаў свята каля экспазіцыі Белдзяржуніверсітэта*

Свята атрымалася вельмі маштабным. Цэнтр горада – вуліцы, плошчы, старадаўні парк – былі запоўненыя кніжнымі экспазіцыямі, імправізаванымі сцэнічнымі пляцоўкамі. З вялікім размахам працаваў "Горад майстроў", гучалі вершы, песні, музыка...

Нашу універсітэцкую кнігу на свяце прадстаўлялі ўпраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы і РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ".

Кнігі выдавецтва БДУ, а гэта курсы лекцый, вучэбныя дапаможнікі, падручнікі, вучэбна-метадычныя комплексы, даведнікі і манаграфіі, былі размешчаны ў экспазіцыі тэматычнай кніжнай пляцоўкі "Хачу ўсё ведаць", а таксама ў павільёне "Кнігі Беларусі: сучасны стан" і мелі вялікі поспех у наведвальнікаў.

Урачыста прайшлі прэзентацыі кніг з удзелам аўтараў БДУ і гасцей з Сербіі і Расіі. Так, па запрашэнні аўтара 5-й кнігі "Сербская літаратура" Івана Чароты нашу экспазіцыю наведаў Слабадан Ракіціч, вядомы паэт, грамадскі дзеяч, прэзідэнт старэйшага ў Сербіі выдавецтва "Сербская літаратурная супольнасць".

Вялікую цікавасць дзяцей і дарослых выклікала віктарына "Мой універсітэт" і бяспройгрышная латарэя. Каштоўнай аздобай мерапрыемстваў было музычнае суправаджэнне на цымбалах.

У наступным годзе Дзень беларускага пісьменства вырашана правесці ў горадзе Барысаў Мінскай вобласці.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы**
**Фота Наталлі ГЕРАСІМОВІЧ**

## БДУ ў СМІ Беларусі

**Другі беларуска-германскі калёквіум** – БелТА (12.09).

**Прэпарат для комплекснай абароны раслін** – БелТА (12.09).

**Інтэрв'ю з першакурсніцай БДУ Кацярынай Дулуб** – "7 дней" (10.09).

**Міжнародная канферэнцыя "Кампутарны аналіз даных і мадэляванне"** – БелТА (07.09, 12.09).

**Перамога каманды БДУ на XIV Міжнароднай алімпіядзе па матэматыцы сярод студэнтаў** – "Знамя юности" (07.09).

**Аплата за дыплом для студэнтаў, якія не пачалі працу па размеркаванні** – "Народная газета"(05.09).

**Інтэрв'ю са студэнтам БДУ Сяргеям Яфіменка, узнагароджаным медалём "За адвагу"** – "Комсомольская правда – Белоруссия" (05.09); "Настаўніцкая газета" (06.09).

**Каментарый рэктара БДУ Васіля Стражава да падзей тыдня** – "СБ – Беларусь сегодня" (01.09).

**Мазь для вачэй – распрацоўка вучоных НДІ ФХП БДУ** – БелТА (30.08).

**Уручэнне выкладчыкам Ліцэя БДУ пасведчанняў спецфонду Прэзідэнта краіны па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, правядзенне рэктарам Белдзяржуніверсітэта Васілём Стражавым адкрытага ўрока 1 верасня для вучняў Ліцэя** – БелТА (30.08, 01.09, 03.09); "Народная газета" (04.09); "Минск-новости" (10.09).

**Жыллё для студэнтаў** – "Рэспубліка" (30.08); "Экспресс-новости" (30.08), "Знамя юности" (31.08); "Белгазета" (03.09).

**Зорныя дажджы над Беларуссю** – каментарый супрацоўнікаў абсерваторыі БДУ – БелТА (30.08); tut.by (30.08); "Вечерний Минск" (31.08); "Минская правда" (01.09).

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## КНІЖНАЯ ПАЛІЦА
# ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

**Папулярно о механике.** У кнізе папулярна расказваецца пра гісторыю ўзнікнення і станаўлення механікі – адной з навук, без якой немагчыма ўявіць існаванне цывілізацыі і самога чалавека. Апісваюцца сучасны стан гэтай навукі і перспектывы яе далейшага развіцця, з'явы і эфекты, якія выкарыстоўваюцца вынаходнікамі і інжынерамі, прыведзены цікавыя прыклады з тэхнікі і архітэктуры.

*Зарембо О.С.* **Древнегреческий язык.** У дапаможніку выкладзены элементарны курс старажытнагрэчаскай мовы ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай. Правілы граматыкі проста і лаканічна падаюцца ў выглядзе граматычнага даведніка. Прапануюцца практыкаванні і тэксты для чытання і перакладу, а таксама слоўнікі.

*Беляев Б.И.* **Оптическое дистанционное зондирование.** Манаграфія прысвечана праблемам пасіўнага дыстанцыйнага зандзіравання асяроддзя і аб'ектаў у аптычным дыяпазоне даўжынь хваль. Прапануецца сістэмны падыход да развіцця асноўных элементаў дыстанцыйнага зандзіравання.

**Беларуская дыялекталогія ў табліцах і схемах. У 2 ч. Ч. 1. Фанетыка.** Выданне падрыхтавана ў адпаведнасці з вучэбнымі планамі курса "Беларуская дыялекталогія" і з'яўляецца практычным дапаможнікам пры вывучэнні дыялектнай фанетыкі (нацыскнога і ненацыскнога вакалізму, кансанантызму). У выглядзе схем і табліц у ім сістэматызавана і сцісла падаецца вялікі аб'ём вучэбнай інфармацыі.

*Груша А.І.* **Беларуская кірылічная палеаграфія.** У вучэбным дапаможніку



ку на падставе аўтарскіх тэарэтыка-метадалагічных распрацовак і шырокага кола крыніц разглежана паходжанне розных тыпаў, відаў, разнавіднасцяў і варыянтаў беларускага кірылічнага пісьма XI–XVII ст., сфера выкарыстання, заканамернасці іх развіцця і пашырэння.

*Германовіч І.К.* **Беларускія мовазнаўцы. У 2 т. Т. 1.** Кніга складаецца з нарысаў пра жыццё і дзейнасць вядомых беларускіх мовазнаўцаў XIX–XX ст. Аналізуюцца іх лінгвістычныя працы, даецца бібліяграфічны паказальнік прац навукоўцаў і літаратура пра іх.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ**

## ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!
# ПАРКІНГ ПА-СТУДЭНЦКУ



***З пачатку новага навучальнага года ў нашым універсітэце пачалі функцыянаваць дзве веластаянкі.***

Хіба шмат студэнтаў дагэтуль маглі выхваляцца тым, што перад занняткамі пакінулі свой транспарт на паркоўцы? Мабыць, не. Але ўсё змянілася ў лепшы бок, асабліва для тых, хто сочыць за станам свайго здароўя.

Звярніце ўвагу! На тэрыторыі БДУ цяпер створаны дзве стаянкі для веласіпедаў – транспарту, які, акрамя сваёй таннасці, прываблівае і тым, што спрыяе захаванню добрай фізічнай формы яго карыстальнікаў. Як распавёў намеснік начальніка Галоўнага гаспадарчага ўпраўлення Ігар Русакевіч, перадумовай стаў пісьмовы зварот каля пяцідзесяці студэнтаў да рэктара нашай alma mater, якому гэтая прапанова адразу спадабалася. І цяпер кожны жадаючы – або супрацоўнік, або навучэнец, – можа пакінуць свой двухколавы транспарт на спецстаянках па вул. Ленінградскай (27 месцаў) і па вул. Курчатава, 5, што на філіяле БДУ ў Шчомысліцах.

Хочацца верыць, што ў гэтага праекта ёсць будучыня. Бо зараз, як ніколі раней, чалавецтва павінна думаць пра прыроду, клапаціцца аб ёй. Таму пры магчымасці неабходна адмаўляцца ад машын і грамадскага транспарту, якія забруджваюць наваколле, і пераходзіць на экалагічна чыстыя веласіпеды. Шкада аднаго – у горадзе пакуль няма прыдатных умоў для белараху, што, мабыць, стрымлівае частку жадаючых, бо стаянкі з большага пустуюць. Але, здаецца, гэта не надоўга, і хутка колькасць сапраўдных аматараў велатранспарту павялічыцца, што толькі зробіць дворык БДУ больш стракатым і займальным і прыбавіць новых заўзятараў!

Дарэчы, Галоўнае гаспадарчае ўпраўленне заклікае ўсіх прапаноўваць новыя цікавыя ідэі і праекты дзеля паляпшэння камунікацый і інфраструктуры БДУ.

**Лейла ІСМАІЛАВА**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

## ДАСЯГНЕННІ
# НАШ "RECord"!

***Вельмі паспяховым для газеты "Універсітэт" атрымаўся ўдзел у VI Міжнародным фестывалі маладзёжнай прэсы "Націскай на RECord", які прайшоў з 6 па 9 верасня ва Украіне, дзе выданне БДУ было прызнана найлепшай студэнцкай газетай.***

Каля 170-ці прадстаўнікоў маладзёжных выданняў з Расіі, Украіны і Беларусі ўдзельнічалі ў вучэбна-азнаямляльнай, творчай і конкурснай дзейнасці на украінскай зямлі. Акрамя друкаваных СМІ, "на RECord" націскалі супрацоўнікі радыё і тэлебачання. Пададзеныя рэдакцыямі на конкурс нумары газет ацэньвала журы, у склад якога ўваходзілі вядомыя украінскія і расійскія журналісты. У выніку – у намінацыі "Найлепшая студэнцкая газета" перамогу атрымаў "Універсітэт", які таксама быў адзначаны спецыяльным дыпломам Нацыянальнага саюза журналістаў Украіны.

Акрамя таго, прадстаўнікі нашай рэдакцыі бралі ўдзел у бліц-конкурсе на выраб спецыяльнага выпуска фестывальнай газеты, дзе здолелі заняць III месца сярод 30-ці іншых выданняў і былі асобна вылучаны за творчы ўнёсак.

**Аляксандр САЛАМАХІН**

## НАВІНЫ СТУДГАРАДКА
# ДВОЙЧЫ Ў АДНУ РАКУ...

***У конкурсе на лепшае азеляненне і кветкавае афармленне інтэрнатаў, размешчаных на тэрыторыі Ленінскага раёна горада Мінска, І месца заняў Студэнцкі гарадок Беларускага дзяржаўнага універсітэта.***



*Загадчыца інтэрната № 5 (у цэнтры) Ала Шакурына і студэнты з узнагародамі за перамогу ў конкурсе*

Арганізатарам конкурсу выступіла адміністрацыя Ленінскага раёна, якая з ранняй вясны назірала за працай намінантаў. Канчатковыя вынікі былі падведзены ў жніўні, калі дворыкі сталі самымі сапраўднымі кветнікамі.

Другі год запар пераможцай у конкурсе прызнаны ўнутраны дворык Студэнцкага гарадка, што паміж двума інтэрнатамі № 2 і № 5. Заслуга найлепшымі атрымоўваецца дзякуючы сумесным намаганням адміністрацыі Студгарадка БДУ, а таксама творчаму пошуку, штодзённай карпатлівай працы і клопату работнікаў інтэрната № 5 і студэнтаў, якія там пражываюць.

Урачыстае ўзнагароджванне пераможцаў адбылося 8 верасня ў рамках святкавання Дня горада на цэнтральнай пляцоўцы парка імя Грэкавай. Дыплом, ліст з падзякай і памятныя падарункі былі ўручаны загадчыцы інтэрната № 5 Але Шакурынай.

**Дзяніс ПІСАРЭНКА**

# ДЗЕНЬ, КАЛІ ЖАДАННІ ЗДЗЯЙСНЯЮЦЦА

Штогод некалькі тысяч выпускнікоў мараць пра адно і тое ж – паступіць у ВНУ. Самыя таленавітыя і падрыхтаваныя гэтую мару здзяйсняюць – яны становяцца студэнтамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. І тут у большай частцы іншагародніх навучэнцаў узнікае новае жаданне – стаць гарадкоўцам, то бок атрымаць запаветнае месца ў інтэрнаце. Сёлета яно спраўдзілася ў болей за тысячы навасепечаных студэнтаў.

Новых жыхароў сардэчна сустрэлі ў Студэнцкім гарадку, дзе адбылося знаёмства з работнікамі інтэрнатаў і студэнцкім актывам, які дапамагалі ім правільна запоўніць усе неабходныя дакументы, рашыць побытавыя пытанні, пазнаёміі з правіламі пражывання.

У пачатку верасня ў кожным з інтэрнатаў ладзіцца традыцыйныя сустрэчы-знаёмствы са студэнтамі І курса. Дырэктар і работнікі Студгарадка, а таксама супрацоўнікі інтэрнатаў распавядаюць пра асаблівасці інтэрнацкага жыцця, а таксама пра тыя магчымасці, якія адкрываюцца перад студэнтамі, што цікавяцца грамадскай дзейнасцю, работай студэнцкага самакіравання, імкнуцца арганізаваць свой вольны час насычана і займальна.

Падчас сустрэч першакурснікам прапаноўваюць падзяліцца сваімі запаветнымі жаданнямі: яны іх запісваюць і кідаюць ў чароўны куфэрак. А затым... Адно з іх здзяйсняецца адразу на месцы! Так, дзяўчыне, якая марыла пра тэлевізар з халадзільнікам, адміністрацыя Студгарадка падарыла латарэйны білет, а хлопцу, які пажадаў сабе добра вучыцца, дастаўся набор канцылярскіх прылад. ...А хтосьці замовіў кілаграм марозіва!

Напрыканцы сустрэч усе разам фатаграфуюцца для летапісу першакурснікаў, каб праз некалькі гадоў можна было зайсці ў родны інтэрнат і прыгадаць той дзень, калі жаданні здзяйсняюцца...

**Іна ХАЗЕЕВА**

## ВІНШУЕМ!
# РАЗАМ ВЕСЯЛЕЙ!

***Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Беларускі дзяржаўны універсітэт ужо 5 гадоў разам.***




Круглую дату сваёй дзейнасці займальна адзначыла пярвічная арганізацыя ГА "БРСМ" БДУ, якая зладзіла 6 верасня на універсітэцкім скверыку для ўсіх жадаючых катанне на конях, якіх "пазычыў" Мінскі заапарк.

БРСМ БДУ – гэта калектыў маладых і актыўных студэнтаў, колькасць якіх за апошнія два гады павялічылася болей чым у два разы і сёння складае 4563 чалавекі. Яны ўмеюць не толькі весела бавіць час, але і якасна працаваць. Універсітэцкі БРСМ мае шырокі спектр дзейнасці – гэта арганізацыя другаснай занятасці моладзі праз Студэнцкі цэнтр занятасці, у тым ліку і падчас летніх канікул, і ўзаемадзеянне з Саветам ветэранаў БДУ, сумесна з якім праводзяцца святочныя мерапрыемствы, а таксама сустрэчы студэнтаў з удзельнікамі баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў.

Вялікая ўвага надаецца валанцёрскаму руху, дабрачынным акцыям. З гэтай мэтай рэалізуецца праграма "Падзяліся цяплом душы тваёй", у рамках якой нашы студэнты наведваюць выхаванцаў дзіцячых дамоў.

Акрамя таго, БРСМ падтрымлівае інтэрнэт-партал "Студэнцкае скрыжаванне", дзе месціцца інфармацыя пра дзейнасць арганізацыі і яе самыя значныя мерапрыемствы, а таксама ладзіць конкурс літаратурных твораў да Дня БДУ; віктарыну, прысвечаную Дню Перамогі; конкурс плакатаў, накіраваных на прапаганду здаровага ладу жыцця; турніры па боўлінгу, більярдзе, інтэлектуальны турнір "Што? Дзе? Калі?".

Далучайцеся да нашых акцый і вы не пашкадуеце!

**Дар'я ПРЫШЧЭПАВА**
**Фота Аляксандра СНАПКА**

## НЕ ПРАМІНІЦЕ!
# ТЭАТРАЛЬНЫ КУФАР–2007

**З 1 па 6 кастрычніка 2007 года Беларускі дзяржаўны універсітэт і ўпраўленне па справах культуры БДУ праводзіць IV Міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў "Тэатральны куфар–2007". Фестывальная праграма распачынаецца з 1 кастрычніка!**

Да ўдзелу ў фестывалі запрошаныя тэатральныя калектывы з Беларусі, Расіі, Латвіі, Бельгіі, Эстоніі, Швейцарыі, Балгарыі, Бразіліі. Усяго – 17 спектакляў і каля 200 удзельнікаў.

З болей падрабязнай інфармацыяй, а таксама праграмай фестывалю вы можаце пазнаёміцца на сайце http://www.theatre-fest.bsu.by.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення па справах культуры**

## З УСМЕШКАЙ

На ваеннай кафедры:
– Уявіце сабе: ляціць нейтрон, трапляе ў ядро, ядро – у шматкі, і з яго вылятае яшчэ два нейтроны! Кожны з іх трапляе ў другое ядро і г. д. і г. д. І вось пайшла-паехала ланцужковая рэакцыя...
– Таварыш маёр, а адкуль бярэцца першы нейтрон?
– Іыыыыы... Мнэ-мнэ... Аааа... А вось гэта і ёсць дзяржаўная тайна!

***

Прафесар біялогіі заяўляе на лекцыі:
– А зараз мы будзем прэпараваць жабку.
Выцягвае з партфеля нейкі скрутак, разгортвае яго, а там... бутэрброд. Прафесар (задуміва):
– Дзіўна, я ж жа з'еў свой сняданак...

***

Едуць два студэнты ў трамваі, народу – поўна. Побач сядзіць бабуля і пазірае на аднаго небараку.
– Які худзенькі! Выдатнік нябось! – гаворыць бабулька.
– Ды не, толькі харашыст, – адказвае той.
– Ну, давай хоць плашч патрымаю!
– А гэта не плашч, бабуля, гэта і ёсць выдатнік!

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года
Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР
Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года
20 верасня 2007 года
Падпісана да друку 18.09.2007 г.
Зак. 848. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6
Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by